Голас душы

Яднанне ў любові

№ 6-7 (532)
Субота, 6 жніўня 2016 г.

Штотыднёвы хрысціянскі бюлетэнь

# БУДСЛАЎСКІЯ ЎРАЧЫСТАСЦІ: ПАПСКІ ЛЕГАТ ПЕРАДАЎ БЕЛАРУСКІМ ГРЭКА-КАТОЛІКАМ РЭЛІКВІЮ СВ. ЯЗАФАТА КУНЦЭВІЧА




Разам з Марыяй мы сёння дзякуем Богу за сярэбраны юбілей адраджэння структур Каталіцкага Касцёла ў Беларусі», – сказаў на Святой Імшы ў ноч з 1 на 2 ліпеня падчас урачыстасцяў у Нацыянальным санктуарыі ў Будславе Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч.

У Эўхарыстыі ўдзельнічаў спецыяльны пасланнік Папы Францішка арцыбіскуп Вены кардынал Крыстаф Шонбарн OP, які падчас яе перадаў беларускім грэка-католікам рэліквію святога Язафата Кунцэвіча.

Імшы папярэднічала велічная працэсія з копіяй абраза Маці Божай Будслаўскай. Дапаможны біскуп Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі Юрый Касабуцкі агучыў ліст Папы Францішка да легата на ўрачыстасці ў Будславе кардынала Крыстафа Шонбарна іпрывітальнае слова новага Апостальскага Нунцыя ў Беларусі мансеньёра Габара Пінтэра з нагоды святкавання ў Нацыянальным санктуарыі 25-годдзя заснавання Мінска-Магілёўскай мітраполіі.

*Працяг на стар. 2*

# БУДСЛАЎСКІЯ ЎРАЧЫСТАСЦІ: ПАПСКІ ЛЕГАТ ПЕРАДАЎ БЕЛАРУСКІМ ГРЭКА-КАТОЛІКАМ РЭЛІКВІЮ СВ. ЯЗАФАТА КУНЦЭВІЧА

*Працяг. Пачатак на стар. 1*

Дапаможны біскуп Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі Аляксандр Яшэўскі SDB агучыў на Імшы ліст Папы Францішка да легата на ўрачыстасці ў Будславе кардынала Крыстафа Шонбарна і прывітальнае слова новага Апостальскага Нунцыя ў Беларусі мансеньёра Габара Пінтэра.



«Мы суправаджаем Цябе, дастойны наш брат, у Тваёй місіі выканання гэтага задання. Урэшце з радасцю ўдзяляем Табе Нашае Апостальскае благаслаўленне, знак нашай добразычлівасці да Цябе і нябеснага дару; перадай жа яго ўсім удзельнікам цэлебрацыі», – гаворыцца ў лісце Папы да кардынала Крыстафа Шонбарна.

«Калі вы сёння сабраліся ў Нацыянальным санктуарыі Божай Маці, каб з радасцю і надзеяй паглядзець на 25 гадоў падараванай Богам гісторыі Мінска-Магілёўскай мітраполіі і дзякаваць за іх, я прашу кожнага з вас асаблівым чынам маліцца за нашага Святога Айца Францішка, за ўсю нашу краіну Беларусь, аб шматлікіх і святых пакліканнях да святарства і манаскага жыцця, за шматлікія добрыя хрысціянскія сем'і», – адзначаецца ў слове новага Апостальскага Нунцыя ў Беларусі.

«У цяжкія часы ганенняў на веру наш народ давернуўся Марыі, і сёння наша Апякунка – Божая Маці Будслаўская – у працэсіі прывяла да алтара, каб на ім скласці эўхарыстычную ахвяру падзякі за свабоду веравызнання і дар адраджэння веры, перапрасіць за не да канца выкарыстаныя магчымасці, якія нам дае Божы Провід, і таксама прасіць благаслаўлення на будучыню», – сказаў у гаміліі Мітрапаліт Тадэвуш Кандрусевіч.

«Сёння мы дзякуем Богу за дар хрысціянскай веры. Больш за тысячу гадоў у часы спрыяльных для яе росквіту і часы ганенняў яна апладняла нашу зямлю і працягвае гэта рабіць, на фундаменце Евангелля творачы новы Божы народ. Дзякуючы хрысціянству Беларусь не з'яўляецца краінай, дзе паляцца вогнішчы нянавісці і адбываюцца рэлігійныя войны», – звярнуў увагу арцыпастыр.

Па словах іерарха, «схіляючы галовы перад тымі, хто бараніў веру і яе адраджаў, мы, іх нашчадкі, павінны заставацца вернымі сваёй хрысціянскай спадчыне, бо яна – наш выпрабаваны стагоддзямі падмурак для шчаслівай будучыні».



Мітрапаліт дадаў, што гісторыя хрысціянства і Касцёла на беларускай зямлі – «добры ўрок на будучыню, што з Божай дапамогай мы можам дасягнуць вялікіх рэчаў, калі толькі будзем жыць згодна з хрысціянскімі каштоўнасцямі».

*Працяг на стар. 3*

# БУДСЛАЎСКІЯ ЎРАЧЫСТАСЦІ: ПАПСКІ ЛЕГАТ ПЕРАДАЎ БЕЛАРУСКІМ ГРЭКА-КАТОЛІКАМ РЭЛІКВІЮ СВ. ЯЗАФАТА КУНЦЭВІЧА

*Заканчэнне. Пачатак на стар. 1-2*

Арцыбіскуп звярнуў увагу, што хрысціянская цывілізацыя беларускага народа «не з’яўляецца чымсьці скамянелым, яна патрабуе развіцця, патрабуе не толькі традыцыі і ўкрытых у зямлі каранёў гэтага шматвяковага дрэва нашай веры, але таксама новых маладых зялёных галінак і лісцяў». Таксама, па словах Мітрапаліта, трэба памятаць, што «хрысціянства з’яўляецца патрабуючым»: «гэта пастаянная барацьба праўды з фальшам, дабра са злом, прыгажосці з брыдотай, этыкі з грахом, свабоды са зняволеннем, каштоўнасцяў з антыкаштоўнасцямі, сэнсу з бессэнсоўнасцю, жыцця са смерцю, існавання з небыццём».




«Каб у гэтай барацьбе перамагчы, недастаткова толькі верыць у Бога. Трэба яшчэ заставацца верным Яму. Гэта азначае, што не можа быць супярэчнасці паміж тым, у што мы верым, і тым, як жывём», – патлумачыў іерарх.

Мітрапаліт дадаў, што вернасць хрысціянскім караням «не азначае механічнага капіявання прыкладаў з мінулага»: «яна павінна быць творчай, гатовай адплысці на глыбіню, адкрытай на новыя выклікі, чулай да знакаў часу». «Праяўляецца яна таксама і ў клопаце аб развіцці роднай культуры, у якой ужо дзесяць стагоддзяў прысутнічае хрысціянскі элемент. Вернасць караням азначае і ўменне будаваць сувязь паміж гістарычнымі каштоўнасцямі, якія былі выпрабаваны часам, і выклікамі сучаснасці, паміж верай і культурай, Евангеллем і жыццём, – як кажа св. Ян Павел ІІ», – заўважыў арцыбіскуп.

«Гэтую творчую вернасць чалавек сам без Божай дапамогі не можа перадаць іншым. Марыя прыняла Божую волю, засталася ёй вернай, перадала людзям свайго часу і перадае нам. Як Маці Міласэрнасці, Яна заўсёды клапоціцца пра нас і ніколі не пакідае адных з нашымі праблемамі, – сказаў іерарх. – Марыя, як Маці Міласэрнасці, заўсёды з намі, каб даць нам надзею, нават насуперак надзеі».

«Маці Божая Будслаўская, Ты ўжо больш за чатырыста гадоў бароніш нас і вядзеш да Твайго Сына, у Юбілейны Год Божай Міласэрнасці і ў юбілей 25-годдзя адраджэння структур Каталіцкага Касцёла ў Беларусі Табе давяраем наш лёс. Выпрасі ў свайго Сына ласку заўсёды заставацца вернымі нашаму хрысціянскаму пакліканню, быць яго сведкамі і бараніць духоўныя каштоўнасці, якімі Бог нас адорвае ў адроджаным Касцёле», – з гэтымі словамі звярнуўся арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч да Панны Марыі.

Падчас Імшы папскі пасланнік кардынал Крыстаф Шонбарн перадаў беларускім грэка-католікам рэліквію св. Язафата Кунцэвіча – набедранік, частку яго арцыбіскупскага адзення.

«Атрымаць каштоўную рэліквію, набедранік – знак архіпастырскага служэння св. Язафата – для нас духоўнае ўмацаванне ў



нашай веры і вернасці Рымскаму Апостальскаму Пасаду, заахвочванне да руплівага сведчання Евангелля», – адзначыў Апостальскі візітатар для грэка-католікаў Беларусі архімандрыт Сяргей Гаек.

*Паводле Catholic.by*

# «СЁННЯ Я МАЮ МАГЧЫМАСЦЬ БЫЦЬ СВЕДКАМ ВАШАЙ МОЦНАЙ ВЕРЫ»




Кардынал Крыстаф Шонбарн у гаміліі звярнуў увагу на тры элементы Божага слова на гэты дзень. Першы – тое, што Маці Божая і св. Альжбета прывіталі адна адну, другі – словы св. Альжбеты: «І адкуль мне гэта, што Маці Пана майго прыйшла да мяне?», трэці – словы: «Шчаслівыя тыя, хто паверыў, што было сказана Панам».

Кажучы пра першы элемент, іерарх адзначыў: «Дзве жанчыны, якія чакаюць патомства, абдымаюцца. Я хацеў бы ад шчырага сэрца падзякаваць усім маці, якія знаходзяцца на гэтай Імшы. Кожны з нас калісьці таксама знаходзіўся пад сэрцам маці. Якая прыгожая гэтая таямніца, што кожны з нас мае сваю ўласную маці! Я таксама вельмі шчаслівы, што яшчэ жывая мая маці, якой 96 гадоў. І мы заўсёды застаемся дзецьмі сваёй маці і ўдзячныя ім за тое, што яны нам даюць».

Нагадваючы, што Марыя і Альжбета – сваячкі, кардынал дадаў: «Прыгожым з'яўляецца таксама тое, што мы маем сям'ю». «Усе мы, Касцёл і кожны з нас, даём моцнае сведчанне, што верым у сям'ю, – сказаў іерарх. – Сям'я павінна трымацца разам. Таму мы моцна спадзяёмся на сілу і моц сям'і».




Разважаючы пра другі элемент – словы «Адкуль мне гэта, што Маці Пана Майго прыйшла да мяне?» – папскі пасланнік заўважыў: «Альжбета здзіўлена, што Марыя прыйшла да яе, бо адчувае, што разам з Марыяй да яе прыходзіць Езус. І сёння разам з вамі ў гэтым прыгожым месцы я магу дзякаваць Усемагутнаму Богу, што Марыя прыходзіць з Хрыстом і да нас. Яна прыйшла ў гэтую краіну, да гэтых людзей, і Яна жадае таксама прыйсці ў нашы сем'і. І кожны з нас за св. Альжбетай можа сказаць: "Адкуль мне гэта, што Маці Пана майго прыйшла да мяне?"» «Я ўпэўнены, што ў кожнай сям'і вы маеце абраз Маці Божай, – дадаў кардынал Крыстаф Шонбарн. – Марыя жадае прыйсці да кожнага з нас».

Кажучы пра трэці элемент – словы «Шчаслівыя тыя, хто паверыў», – папскі легат падкрэсліў: «Моцная вера Марыі падаравала нам Хрыста. Таму мы маем прыгожую магчымасць цалкам аддаць нашу веру веры Маці Божай. Вельмі часта наша вера вельмі слабая, але Маці Божая мае моцную веру. І калі я перажываю цяжкасці са сваёй слабой верай, то магу з моцнай верай Марыі звяртацца да Хрыста».

*Працяг на стар. 5*

# «СЁННЯ Я МАЮ МАГЧЫМАСЦЬ БЫЦЬ СВЕДКАМ ВАШАЙ МОЦНАЙ ВЕРЫ»

*Заканчэнне. Пачатак на стар. 4*




«Я хацеў бы падзякаваць кожнаму з вас, – сказаў кардынал удзельнікам Імшы. – Сёння я маю магчымасць быць сведкам вашай моцнай веры. І мы разам можам сказаць: шчаслівая тая краіна, якая паверыла, тая сям'я, якая паверыла, шчаслівы кожны з нас, хто паверыў».




«Марыя моцна верыла, што збудуцца словы, якія Яна пачула ад анёла. Я жадаю кожнаму з вас, каб Найсвяцейшая Маці несла вашу веру ў цяжкія часы, каб узмацняла яе і была для вас моцнай апорай», – пажадаў іерарх вернікам.

Адбылася таксама эўхарыстычная працэсія, а потым прагучала малітва падзякі за дар свабоды веравызнання і 25-годдзе заснавання Мінска-Магілёўскай мітраполіі.

«Усемагутны і вечны Божа! Стоячы каля падножжа нашай нябеснай Заступніцы і Апякункі – Маці Божай Будслаўскай, у Надзвычайны Юбілейны Год Божай Міласэрнасці і сярэбраны юбілей заснавання Мінска-Магілёўскай мітраполіі мы дзякуем Табе за дар свабоды веравызнання і спрыянне ў развіцці Касцёла, – гаворыцца ў малітве. – Заступніцтвам Найсвяцейшай Багародзіцы мы зноў набылі страчаную спадчыну веры. Прымі, Міласэрны Ойча, нашу малітву падзякі за Маці Твайго Сына і нашу духоўную Маці, якая ў Фаціме прадказала наша навяртанне. Наша падзяка непараўнальная з Яе заслугамі. Дазволь Ёй і далей быць нашаю Апякункаю і Заступніцаю».

Таксама на заканчэнне Імшы прадстаўнікі ўсіх дыяцэзій Беларусі – каля 30 чалавек – атрымалі з рук кардынала Крыстафа Шонбарна ганаровыя граматы за ўклад у станаўленне і развіццё Каталіцкага Касцёла ў Беларусі.

*Паводле Catholic.by*

# «БЕЛАРУСЬ МОЖА АДЫГРЫВАЦЬ РОЛЮ ПАСРЭДНІКА ПАМІЖ КАТАЛІЦКІМ КАСЦЁЛАМ І ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВОЙ»

*Вялікім гонарам і радасцю называе кардынал Крыстаф Шонбарн OP сваю місію папскага пасланніка на ўрачыстасці 25-годдзя заснавання Мінска-Магілёўскай мітраполіі, якія святкаваліся ў Будславе 1-2 ліпеня.*

***–Ваша Эміненцыя, ужо шмат гадоў Вы займаецеся тэмай дыялогу паміж праваслаўнымі і каталікамі, у гэтым пытанні Вас можна назваць экспертам. Наколькі гэты дыялог можна назваць удалым і як, па-Вашаму, ён будзе развівацца ў будучыні?***

–Падчас сустрэчы з Мітрапалітам Паўлам я падкрэсліў, што адным лёгкім дыхаю па-каталіцку, а другім лёгкім – па-праваслаўнаму. Хрысціянства без сваёй усходняй паловы не будзе поўным. Мы – як два лёгкія.

Папа Ян Павел II заўсёды казаў, што Касцёл павінен дыхаць двума лёгкімі – усходнім і заходнім. Таму для мяне не стаіць пытанне, удалы дыялог ці не, патрэбны ён ці не, для мяне гэты дыялог – само сабой зразумелае.

Мозг чалавека таксама мае два паўшар'і: і можа быць так, што злучэнні паміж левым і правым паўшар'ем недастаткова моцныя. Тады, напрыклад, інтэлектуальнасць будзе вельмі моцная, а эмацыйнасць – вельмі слабая ці наадварот. Тое ж я бачу і паміж хрысціянскімі Цэрквамі. Але адзін без аднаго мы нічога не можам.

Дыялог складаны, але гэта мяне не палохае – цяжкасці ёсць заўсёды.

***–У беларускай медыясферы падчас гістарычнай сустрэчы Пантыфіка ў Гаване з надзеяй адзначалі, што Беларусь таксама магла б выступіць пляцоўкай для такой сустрэчы. Якія Вашыя думкі на гэты конт?***

–Пра сустрэчу ў Гаване я ведаю не больш, чым з паведамленняў СМІ. Як і не ведаю дэталяў сустрэчы вашага Прэзідэнта з Пантыфікам.

Аднак, мяркуючы па тым, што я ўбачыў тут, Беларусь можа адыгрываць ролю пасрэдніка паміж Каталіцкім Касцёлам і Праваслаўнай Царквой.

У сённяшніх умовах вырашальным з'яўляецца і той факт, што Беларусь не ўцягнута ў расійска-ўкраінскі канфлікт. І падобная сустрэча на беларускай зямлі магла б паспрыяць вырашэнню гэтага канфлікту.

Але, вядома, сустрэча можа адбыцца толькі тады, калі і іншыя бакі таксама гэтага захочуць.

***–Падчас візіту Вы сустракаліся з Міністрам замежных спраў Беларусі Уладзімірам Макеем. Якія тэмы падымаліся падчас размовы?***

–Я быў вельмі рады пазнаёміцца з вашым міністрам, які ў свой час заканчваў дыпламатычную акадэмію ў Вене і гэтым быў звязаны з Аўстрыяй. Ён вельмі добра размаўляе па-нямецку.




Мы, канешне, гаварылі ў тым ліку і пра апошні візіт беларускага Прэзідэнта ў Ватыкан і яго сустрэчу з Папам Францішкам. Таксама абмяркоўвалі шансы таго, ці магчымым быў бы зваротны візіт – і якія перадумовы павінны для гэтага быць.

Вядома, з аднаго боку гэтага павінен хацець сам Папа Францішак, а па-другое, у краіне для гэтага павінны быць перадумовы. Прыгадвалі мы і сустрэчу Папы Францішка з Патрыярхам Кірылам у Гаване, яе значэнне ў пытанні міру на Блізкім Усходзе і ва Украіне. Мір ва Украіне – яшчэ адна асобная тэма нашай сустрэчы.

Урэшце, мы закранaлі і свабоду рэлігіі, правa чалавека на свабоду веравызнання. Мы размаўлялі пра мадэль узаемаадносін рэлігіі і дзяржавы ў Аўстрыі, абмяркоўваючы ў гэтым святле свабоду рэлігіі і яе ролю ў дзяржаўнай палітыцы Беларусі. Такімі былі асноўныя пункты сустрэчы.

*Працяг на стар. 6*

# «БЕЛАРУСЬ МОЖА АДЫГРЫВАЦЬ РОЛЮ ПАСРЭДНІКА ПАМІЖ КАТАЛІЦКІМ КАСЦЁЛАМ І ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВОЙ»

*Працяг. Пачатак на стар. 6*

«Касцёл у Беларусі моцны, але ўсё роўна ён – канфесійная меншасць».

***–Вы прабылі ў Беларусі тры дні. Што ўразіла Вас найбольш за гэты час?***

–Я ўбачыў вельмі жывы Касцёл. Касцёл, які не спыніўся ў сваім развіцці, залізваючы раны мінулага. Касцёл з маладым тварам, які жыве сённяшнім днём ва ўмовах беларускіх рэалій.



Але мае ўражанні фрагментарныя. Ёсць шмат бакоў і тэм, пра якія я хацеў бы даведацца больш. Напрыклад, я не меў часу пазнаёміцца са студэнтамі ва ўніверсітэтах. Не так шмат даведаўся пра святароў і парафіі ў іх звычайным жыцці. Але мяне ўразілі асобныя моманты, сустрэчы і людзі.

Уразілі шматлікія споведзі за базылікай у Будславе – доўгія чэргі людзей, якія хацелі паспавядацца. Уразіла будслаўская Імша апоўначы – і тыя 30 тысяч чалавек, якія маліліся і спявалі. У Будславе я ўбачыў шмат моладзі.

Не магу не прыгадаць і мемарыяльны комплекс «Трасцянец». Ён мяне вельмі і вельмі крануў. Як і наведванне ў Мінску крыпты Усіхсвяцкай праваслаўнай царквы, у якой знаходзяцца парэшткі ахвяр Трасцянца... Падзеі, якія там адбываліся – гэта вельмі пачварна. Цешыць, што існуе напамін пра гэтыя падзеі – памяць жыве.

А яшчэ мяне вельмі ўразіла падрыхтоўка моладзевага хору на Імшы (гаворка пра Імшу, падчас якой быў асвечаны касцёл Маці Божай Будслаўскай у Мінску – заўв. рэд.). Гэта маладыя парафіяльны хор, а ўжо такі прафесійны! Гэта было вельмі жвава — з такім энтузіязмам яны музіцыравалі!

***–Наколькі іншы Касцёл у Беларусі ў параўнанні з Касцёлам у Аўстрыі?***

–Кожная краіна мае сваю гісторыю і сваю рэальнасць. На жаль, у нас няма інтэнсіўнага прамога кантакту паміж нашымі Касцёламі за выключэннем хіба супрацоўніцтва ў праектах «Карытас».

Але я заўважыў, што ў многіх святынях арганы прывезены з Аўстрыі, як і некаторая аздоба ў касцёлах...

Наша гісторыя адрозніваецца: Аўстрыя стагоддзямі была той краінай, дзе моцна адчуваўся ўплыў адной сям’і – Габсбургаў і каталіцкай канфесіі. Канешне, былі і канфлікты, але гэта непараўнальна з Беларуссю, дзе Каталіцкі Касцёл заўсёды знаходзіўся ў канфесійнай меншасці.

Беларусь перажыла шмат геапалітычных змяненняў, і гэта робіць яе сітуацыю ў Каталіцкім Касцёле іншай, чым у нас. У вас моцная каталіцкая дыяспара. Але, нягледзячы на гэта, Касцёл у Беларусі ўсё ж з’яўляецца канфесійнай меншасцю.

***–Ці можа гэтая меншасць спадзявацца на папскі візіт?***

–Яна павінна спадзявацца (усміхаецца – заўв. рэд.). Надзея ўласціва для нашага жыцця, таму спадзявацца трэба заўсёды. Аднак ацэньваць шансы не так проста, бо ў выпадку з Папам Францішкам ніколі дакладна не ведаеш, што падкажа яму інтуіцыя і Божы Провід.

Гэта можа адбыцца вельмі знянацку. Але можа і не адбыцца...

***–Новы Апостальскі Нунцый, прызначаны ў Беларусь, прыбудзе з Аўстрыі. Верагодна, Вы знаёмыя з мансеньёрам Габарам Пінтэрам, які апошнія гады працаваў у Нунцыятуры ў Вене?***

–Так, я добра яго ведаю. Каля трох гадоў ён працаваў у нашай Нунцыятуры. І я вельмі рады за яго, што ён атрымае біскупскае пасвячэнне і прыбудзе ў вашу краіну для дыпламатычнай працы.

*Працяг на стар. 7*

# «БЕЛАРУСЬ МОЖА АДЫГРЫВАЦЬ РОЛЮ ПАСРЭДНІКА ПАМІЖ КАТАЛІЦКІМ КАСЦЁЛАМ І ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВОЙ»

*Заканчэнне. Пачатак на стар. 6-7*

Апошнія месяцы ён вельмі інтэнсіўна рыхтаваўся, шмат чытаючы пра Касцёл у Беларусі і пра саму Беларусь. Мансеньёр Пінтэр мае адкрытае сэрца, і я думаю, ён будзе вельмі добра падтрымліваць рэальнасць Каталіцкага Касцёла ў вашай краіне – ён мае для гэтага ўсе якасці.

***–Ваша Эмінэнцыя, Вы прымалі ўдзел у Сінодзе Біскупаў на тэму сям'і і прадстаўлялі грамадскасці Апостальскую адгартацыю «Amoris laetitia». Сярод гарачых тэм гэтага дакумента – пазіцыя ў адносінах да гомасексуалістаў і разведзеных. Часта СМІ спрабуюць спекуляваць на гэтай тэме. Што б Вы маглі сказаць на гэты конт?***

–«Amoris laetitia» хоча найперш паказаць, што, дыскутуючы па гэтых пытаннях, варта ўмець па-іншаму паглядзець на праблему. Памятаеце, калі Езус паклікаў Мацвея на мытні і Езус з мытнікамі меў свята. Тады фарысеі сказалі: як можа ён з грэшнікамі сядзець за адным сталом?

Я думаю, што гэта тая ж сітуацыя, што і з «Amoris laetitia». Папа Францішак не кажа, што новы шлюб разведзеных – гэта добра. Пантыфік ніколі не казаў, што развод – не праблема, або што гомасексуальнасць – тое самае, што і гетэрасексуальнасць.

Святы Айцец хоча данесці да нас, што нельга адразу асуджаць чалавека, зусім яго не ведаючы. Кожны з нас найперш чалавек. І гомасексуаліст у першую чаргу такі ж чалавек, як і кожны з нас. Нягледзячы на яго гомасексуальную схільнасць, найперш мы павінны бачыць у ім чалавечае. Гэта вельмі важна.

Няпраўда, што Папа Францішак хоча ў нейкай ступені змяніць вучэнне Касцёла – Пантыфік звяртае ўвагу на тое, як мы абыходзімся з такімі людзьмі, разглядаючы іх толькі пад пэўнай катэгорыяй.

Папа Францішак выступае супраць аднабокага ўспрымання чалавека і хоча запрасіць кожнага цаніць у бліжнім найперш чалавека. Як чалавек з гомасексуальнымі схільнасцямі паводзіць сябе ў працы, якія ён у сваёй веры?



Тое ж і з т.зв. «несакрамэнтальнымі саюзамі». Пантыфік кажа: існуе так шмат розных сітуацый, якія мы зусім не можам асуджаць. Што здарылася з гэтым шлюбам, чаму ён разбіты? Даць адказ на гэтыя пытанні не так проста. Трэба ўглядацца ў чалавека і найперш цаніць яго як чалавека. Не толькі святару, духоўніку, але таксама і свецкаму чалавеку.

Пытанні ад журналістаў на гэту тэму часам сапраўды набіваюць аскому: журналісты хочуць чуць толькі чорна-белыя адказы. У Апостальскай адгартацыі Пантыфік кажа выразна пра тое, што няма толькі чорнага ці белага — ёсць і іншыя фарбы, у якіх мы павінны разгледзець чалавека.

***–Ваша місія пасланніка Папы ў Беларусі завяршаецца. З якімі думкамі Вы пакідаеце Беларусь?***

–Я вельмі ўдзячны, што Папа Францішак даверыў мне гэту місію. Для мяне гэта быў вялікі гонар і перад усім вялікая радасць. У Беларусі я перажыў шмат прыгожага. І з сабою бяру шмат удзячнасці.

Падчас сустрэч, а таксама на Святых Імшах я імкнуўся ўгледзецца ў твары вернікаў. Свядома я вельмі ўважліва ўзіраўся асабліва ў твары пажылых вернікаў, якія перажылі неверагодна цяжкія часы сталінізму, вайны, камуністычнага таталітарызму. Вашы бабулі былі тымі, хто выратаваў веру, і я хачу выказаць ім сваю глыбокую пашану.

Многія з іх спазналі Бога яшчэ ў дзяцінстве і праз часы камунізму пранеслі сваю веру, баронячы яе. І іх вера засталася вельмі шчырай – той, якую яны здабылі ў дзяцінстве. Гэта вельмі ўражвае!

Я сам нарадзіўся ў 1945 годзе і добра памятаю «жалезную заслону» камуністычных краін. Да сёння не магу паверыць, што ўсё гэта ўжо мінула...

*Паводле Catholic.by*

# ПРЭЗБІТЭРСКАЕ ПАСВЯЧЭННЕ ДЫЯКАНА АЎГУСТА КАЛЯСІНСКАГА ПРАЙШЛО Ў МІНСКУ

*25 чэрвеня 2016 г. «гвардыя Хрыста» папоўнілася яшчэ адным духоўным жаўнерам. У мінскай архікатэдры Імя Найсвяцейшай Панны Марыі прайшло прэзбітэрскае пасвячэнне дыякана Аўгуста Калясінскага, якое ўдзяліў Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч.*



25 чэрвеня «гвардыя Хрыста» папоўнілася яшчэ адным духоўным жаўнерам. У мінскай архікатэдры Імя Найсвяцейшай Панны Марыі прайшло прэзбітэрскае пасвячэнне дыякана Аўгуста Калясінскага, якое ўдзяліў арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч.

Дыякан Аўгуст Калясінскі нарадзіўся 31 сакавіка 1989 года. Паходзіць з парафіі Божага Цела ў Нясвіжы. З 2006 па 2013 гг. быў навучэнцам Міждыяцэзіяльнай духоўнай семінарыі імя св. Тамаша Аквінскага ў Пінску.

Дыяканскае пасвячэнне атрымаў 31 кастрычніка 2015 г. ў нясвіжскім касцёле Божага Цела з рук Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча. Апошнім часам праходзіў душпастырска-літургічную практыку ў мінскім касцёле Св. Сымона і Св. Алены.



**«Спроба» святарства і распрацоўка сайтаў**

Сам жа новапрэзбітэр Аўгуст распавёў Catholic.by, што ў семінарыю вырашыў пайсці, «каб проста паспрабаваць».

«Я думаў, калі не атрымаецца, то пайду далей, куды хацеў ісці. Так і трапіў, калі каратка. Пасля школы адразу. Нават не быў ні на якіх рэкалекцыях аб пакліканні. А першы раз прыехаў ужо здаваць экзамены», – заўважыў малады святар.

За час сваёй душпастырска-літургічнай практыкі ў мінскім касцёле Св. Сымона і Св. Алены дыякан Аўгуст разам са сваім сябрам паспеў зрабіць новы парафіяльны сайт. Гэтае захапленне распрацоўкай інтэрнэт-старонак, як аказалася, у яго пачалося яшчэ ў семінарыі.

Яшчэ тады, на 4 курсе, семінарыст Аўгуст падчас акадэмічнага адпачынку зрабіў інтэрнэт-старонку для парафіі Божага Цела ў Нясвіжы.

«Першы сайт я зрабіў проста падкарэкціраваўшы старую версію. Упрыгожыў і паглядзеў, што мне падабаецца. А пробашч заўважыў, што я разбіраюся ў сайтах, і папрасіў зрабіць новую старонку. Так усё і пачалося», – распавёў малады святар.

Але самая галоўная падзея жыцця новапрэзбітэра Аўгуста Калясінскага адбылася ў мінскай архікатэдры.

На ўрачыстую Святую Імшу прыйшлі родныя, сябры і знаёмыя будучага святара, а таксама сябры па семінарыі – навучэнцы і сённяшнія святары, якія разам з ім ішлі да свайго святарскага паклікання.

*Працяг на стар. 10*

# ПРЭЗБІТЭРСКАЕ ПАСВЯЧЭННЕ ДЫЯКАНА АЎГУСТА КАЛЯСІНСКАГА ПРАЙШЛО Ў МІНСКУ

*Заканчэнне. Пачатак на стар. 9*

**Ісці дарогай паклікання моцай Хрыста**

Мітрапаліт Тадэвуш Кандрусевіч, які цэлебраваў Святую Імшу, падзякаваў у гаміліі ўсім тым, хто паспрыяў фармаванню Аўгуста Калясінскага на шляху яго святарскага паклікання.

Асаблівую падзяку іерарх выказаў бацькам, родным і блізкім маладога святара, кансэкраваным асобам, а таксама семінарыі ў Пінску, «якая цягам многіх гадоў фармавала кандыдата ў прэзбітэры».

«Надзвычай важным у наш час, калі ўсё часцей людзі адыходзяць ад Бога і нават жывуць так, як быццам Яго зусім няма, з’яўляецца заданне абвяшчэння Божага слова. Няхай тваё вучэнне будзе сапраўднай духоўнай ежай для народа, да якога ты будзеш пасланы, а прыклад жыцця няхай умацоўвае веру вернікаў і вядзе да Бога тых, хто Яго яшчэ не спазнаў», – звярнуўся Мітрапаліт да новага святара.



Іерарх заахвоціў кс. Аўгуста Калясінскага заўсёды памятаць, што ён будзе здзяйсняць святарскае пакліканне не сваёй моцай, але ад імя Хрыста.

«Таму кожны дзень памірай для граху, каб самому жыць Хрыстом, чыёй моцай будзеш дзейнічаць і чыёй ласкай будзеш адорваць людзей», – працягнуў арцыпастыр.

«У выконванні сваіх святарскіх абавязкаў, дарагі духоўны сын, на першае месца стаў Хрыста, які цябе паклікаў і які павядзе сваёй дарогай. Неабходна толькі да канца даверыцца Яму, бо без Яго мы ніхто», – падкрэсліў арцыбіскуп.

«Няхай заўсёды будзе табе прыкладам Добры Пастыр --, які прыйшоў не для таго, каб Яму служылі, але каб паслужыць і збавіць тых, якія загінулі», – заключыў Мітрапаліт Тадэвуш Кандрусевіч.

**«Рады, што сын зрабіў правільны выбар»**

«Ён з дзяцінства хадзіў у касцёл. Таму я вельмі рада за свайго брата, за тое, што ён выбраў свой шлях. Самае галоўнае, каб яму было добра, тады і мы будзем задаволеныя», – заўважае сястра новага святара Вольга.

Вельмі шчаслівым і радасным у гэты дзень выглядаў таксама бацька новапрэзбітэра Зыгмунт Калясінскі, які прыехаў на пасвячэнне сына з Нясвіжа.

«Мой сын быў міністрантам. Заўсёды быў прыкладным хлопцам, пры алтары любіў прыслужваць. І я вельмі рады за яго, што ён зрабіў правільны выбар у сваім жыцці. Значыць, я не дарма на свеце жыў, што ў мяне такі сын», – з гонарам распавёў Зыгмунт Калясінскі.

Пасля пасвячэння святар Аўгуст Калясінскі прымаў шматлікія віншаванні і падарункі ад сваіх родных, блізкіх, сяброў, знаёмых і вернікаў, да якіх ужо паспеў данесці Божае слова падчас сваёй душпастырска-літургічнай практыкі.

25 чэрвеня Касцёл у Беларусі атрымаў яшчэ аднаго святара – Аўгуста, пакліканага абвяшчаць Бога людзям «не сваёю моцай, а моцай Езуса Хрыста».

*Паводле Catholic.by*



# НОВАПРЫЗНАЧАНЫ АПОСТАЛЬСКІ НУНЦЫЙ У БЕЛАРУСІ МАНС. ГАБАР ПІНТЭР АТРЫМАЎ БІСКУПСКАЕ ПАСВЯЧЭННЕ

*15 ліпеня 2016 г. у катэдральным касцёле Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі і арханёла Міхаіла ў г. Вац (Венгрыя) адбылося біскупскае пасвячэнне мансеньёра Габара Пінтэра, якога Папа Францішак прызначыў Апостальскім Нунцыем у Беларусі*

Галоўным пасвячаючым быў Дзяржаўны Сакратар Яго Святасці Папы Францішка кардынал П'етро Паралін, асістуючымі – Прымас Венгрыі кардынал Пэтэр Эрдзё і ардынарый дыяцэзіі Вац біскуп Міклаш Бэер. Беларусь прадстаўлялі Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч і біскуп Пінскі Антоні Дзям'янка.




Ва ўрачыстай Імшы прымаў удзел таксама арцыбіскуп Вены кардынал Крыстаф Шонбарн, які два тыдні таму ў якасці папскага легата ўзначаліў юбілейныя ўрачыстасці 25-годдзя ўстанаўлення Мінска-Магілёўскай мітраполіі.

Усяго ў Імшы ўдзельнічалі 25 біскупаў, сярод якіх іерархі Венгрыі, у тым ліку грэка-каталіцкі епіскап, прадстаўнікі епіскапатаў Аўстрыі, Сербіі, Славеніі, Харвацыі, Беларусі, а таксама каля 100 святароў. Былі прысутныя праваслаўны архіепіскап Вены і Будапешта Сербскага Патрыярхату, віцэ-прэм'ер Венгрыі і парламентарыі.

Кардынал П'етро Паралін у гамілії заклікаў новапрызначанага Апостальскага Нунцыя быць міласэрным прарокам нашага часу, які дае надзею. Галоўнае заданне біскупа, па словах кардынала, – быць пастырам паводле прыкладу Езуса, Добрага Пастыра і слугі людзей.

Шмат увагі кардынал П'етро Паралін прысвяціў заданням Нунцыя як прадстаўніка Святога Айца, які павінен дапамагаць мясцоваму Касцёлу ў выкананні яго непасрэдных функцый весці людзей шляхам збаўлення, а таксама развіваць адносіны паміж Апостальскім Пасадам і канкрэтнай краінай, у дадзеным выпадку з Беларуссю. Кардынал падкрэсліў, што мансеньёр Габар Пінтэр будзе служыць у Беларусі, дзе Касцёл 25 гадоў таму атрымаў свабоду і дзе гэты Касцёл жывы, мужна сведчыў і працягвае сведчыць сваю веру.

Таксама Дзяржаўны Сакратар Папы звярнуў вялікую ўвагу на неабходнасць далей пашыраць адносіны з Праваслаўнай Царквой, каб разам сведчыць хрысціянскія каштоўнасці. Іерарх пажадаў новаму Нунцыю, каб дзякуючы яго ініцыятывам Беларусь больш адкрывалася на іншыя




краіны і каб яны адкрываліся на Беларусь; пажадаў, каб у яго жыцці рэалізаваўся дэвіз яго біскупскага служэння: «Gaudium et spes» – «Радасць і надзея».

*Працяг на стар. 12*

# НОВАПРЫЗНАЧАНЫ АПОСТАЛЬСКІ НУНЦЫЙ У БЕЛАРУСІ МАНС. ГАБАР ПІНТЭР АТРЫМАЎ БІСКУПСКАЕ ПАСВЯЧЭННЕ

*Заканчэнне. Пачатак на стар. 11*

Арцыбіскуп Габар Пінтэр у сваім слове падзякаваў кардыналу П’етро Параліну, усім прысутным біскупам, прадстаўнікам ураду і вернікам, якія напаўнялі катэдральны касцёл, і прасіў маліцца ў яго інтэнцыі, каб ён мог годна выканаць ускладзеную на яго місію.



Новапрызначаны Нунцый прамаўляў на італьянскай, англійскай, нямецкай, французскай і венгерскай мовах. Астатнія духоўныя асобы прамаўлялі на трох мовах у наступным парадку: венгерскай, нямецкай і італьянскай. У цэлым актыўна выкарыстоўвалася нямецкая мова.

рачыстасць, упрыгожаная спевамі двух хораў – дарослага і дзіцячага, – працягвалася тры з паловай гадзіны.

Біскупскае пасвячэнне новага Нунцыя, прызначанага ў Беларусь, сталі добрай акацыяй для Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча сустрэцца з многімі іерархамі. Кардынал Крыстаф Шонбарн паведаміў беларускаму арцыпастыру, што два дні таму перадаў Святому Айцу рапарт аб урачыстасцях юбілею 25-годдзя заснавання Мінска-Магілёўскай мітраполіі. Таксама кардынал сказаў Пантыфіку, што католікі Беларусі чакаюць яго. У адказ Папа ўзгадаў візіт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Ватыкан. Акрамя таго, кардынал Шонбарн з вялікім энтузіязмам распавёў іншым біскупам аб будслаўскіх урачыстасцях, падкрэсліваючы, што ў іх прымала ўдзел 30 тысяч вернікаў.

Мітрапаліт Тадэвуш Кандрусевіч падчас сустрэчы з Дзяржаўным Сакратаром Папы кардыналам П’етро Паралінам і новапрызначаным Апостальскім Нунцыем арцыбіскупам Габарам Пінтэрам пазнаёміў іх з апошнімі трывожнымі падзеямі ў жыцці Касцёла ў Беларусі, якія, як дадаў іерарх, на шчасце, паспяхова вырашыліся. Таксама Мітрапаліт праінфармаваў іх аб тым, што справа выдзялення зямлі пад будынак Тэалагічнай акадэміі ідзе наперад. Кардынал і Апостальскі Нунцый былі задаволены паспяховым вырашэннем складаных пытанняў з жыцця Касцёла ў Беларусі.



Арцыбіскуп Габар Пінтэр прыбудзе ў Беларусь у сярэдзіне жніўня.

*Паводле Catholic.by*

# «НАВУЧЫЦЦА СЛУХАЦЬ І АХВЯРОЎВАЦЬ БОЛЬШ ЧАСУ ЛЮДЗЯМ»

*17 ліпеня 2016 г. ў разважаннях перад малітвай «Анёл Панскі» на ватыканскай плошчы Папа Францішак адзначыў, што не дастаткова толькі прыняць госця ў свой дом і клапаціцца пра яго матэрыяльныя патрэбы, але што і ў роўнай ступені трэба таксама яго выслухаць і зразумець.*

«У сённяшнім Евангеллі евангеліст Лука расказвае пра Езуса, калі Ён падчас свайго падарожжа ў Ерузалем увайшоў у адну вёску і быў прыняты дзвюма сёстрамі: Мартай і Марыяй (Лк 10, 38-42). Яны абедзве прапанавалі гасціннасць Пану, але кожная па-свойму. Марыя села каля ног Езуса і слухала Яго словы (Лк 10, 39), калі Марта была занятая тым, каб падрыхтаваць да стала, і ў пэўны момант сказала Езусу: “Пане, ці Табе ўсё адно, што сястра мая пакінула мяне адну прыслугоўваць? Таму скажы ёй, каб дапамагла мне” (Лк 10, 40). І Езус ёй адказаў: “Марта, Марта, ты турбуешся і клапоцішся пра многае, а патрэбна толькі адно. Марыя ж выбрала найлепшую частку, якая не адымецца ў яе” (Лк 10, 41-42).

У сваёй мітусні і занятках Марце пагражае забыццё – гэта праблема – пра найважнейшыя справы, у гэтым выпадку пра Езуса. Забываецца пра самога госця. А госцю не дастаткова толькі служыць, накарміць яго, клапаціцца пра яго розным чынам. Трэба, перад усім, яго выслухаць. Запомніце гэтае слова: выслухаць. Таму што госць павінен быць выслуханы як асоба са сваёй гісторыяй, сэрцам, поўным пачуццяў і думак, так, каб ён сапраўды адчуваў сябе як дома. Але, калі прымаеш госця ў сваім доме і надалей робіш розныя рэчы, кажаш яму, каб сеў, пасля чаго ён маўчыць і ты маўчыш, – гэта так, як быццам бы ён быў з каменя, каменны госць. Не, госць павінен быць выслуханы. Вядома, адказ, які даў Езус Марце – калі ёй кажа, што важна толькі адно, – знаходзіць сваё поўнае значэнне ў дачыненні да слухання слова самога Езуса, таго Слова, якое асвятляе і падтрымлівае ў нас усе тое, кім мы з'яўляемся, і вызначае, што робім.

Калі мы прыходзім памаліцца, напрыклад, перад крыжам, і гаворым, гаворым і пасля адыходзім, то мы не слухаем Езуса. Не дазваляем, каб Ён прамаўляў да нашага сэрца. Слухаць – гэта ключавое слова. Не забывайце пра гэта.

І мы не павінны забывацца, што таксама ў доме Марты і Марыі Езус з’яўляецца не толькі Панам і Настаўнікам, але і пілігрымам і госцем. Такім чынам, Яго адказ мае першы і непасрэдны сэнс: “Марта, Марта, чаму так шмат клапоцішся пра госця, што нават забываеш пра яго прысутнасць? Каменны госць. Каб сапраўды прыняць яго, не трэба шмат: патрэбна толькі адно: выслухаць Яго – гэтае слова: выслухаць Яго, паказаць яму братэрскі прыём, так, каб ён адчуў сябе ў сям'і, а не ў часовым прытулку”. Зразуметая такім чынам гасціннасць з'яўляецца адным з учынкаў міласэрнасці, чалавечай і хрысціянскай дабрачыннасцю, якая ў сённяшнім свеце здаецца занядбанай. Ствараюцца шматлікія дамы апекі і хоспісы, але не заўсёды ў гэтых установах існуе сапраўдная гасціннасць. Узнікаюць розныя ўстановы, якія клапоцяцца пра розныя формы хвароб, адзіноты, маргіналізацыі, але ў той жа час памяншаецца шанс, каб чужаземец, адкінуты ці выключаны, знайшоў кагосьці, хто быў бы гатовы яго выслухаць, таму што ён з'яўляецца чужаземцам, бежанцам, мігрантам, няма нікога побач, каб выслухаць гэтую балючую гісторыю. Нават у сваім доме, сярод сваіх найбліжэйшых асобаў, можа здарыцца, што лягчэй знайсці розныя паслугі і тэрапіі рознага роду, чым слуханне і прыняцце.

Сёння мы так занятыя, жывём у такой мітусні, са столькімі праблемамі, з якіх частка не такая ўжо важная, што нам не хапае здольнасці слухання. Мы пастаянна занятыя і не маем часу, каб слухаць. Я хацеў бы задаць вам адно пытанне, няхай кожны адкажа на яго ў сваім сэрцы: ці маеш ты, муж, час на выслухоўванне сваёй жонкі? А ты, жанчына, ці маеш час выслухаць свайго мужа? А вы, бацькі, маеце час, “страчаны” час , каб выслухаць сваіх дзяцей? Або сваіх бабулю і дзядулю, пажылых людзей? “Але бабуля і дзядуля заўсёды кажуць адно і тое ж, яны нудныя”. Не, яны абавязкова павінны быць выслуханымі. Прашу вас, каб вы навучыліся слухаць і ахвяроўваць больш часу людзям. У здольнасці слухання знаходзіцца корань міру.

Панна Марыя, Маці слухання і ўважлівага служэння, навучы нас адкрытасці і гасціннасці для нашых братоў і сясцёр», – сказаў Папа.

Пасля малітвы Пантыфік удзяліў усім сабраным на плошчы св. Пятра сваё благаслаўленне і папрасіў усіх не забывацца маліцца за яго самога.

*Паводле беларускай рэдакцыі Ватыканскага радыё*

# «ЛЮДЗІ, ЯКІЯ ІДУЦЬ ПА ЖЫЦЦІ, НЕ ЗАЎВАЖАЮЧЫ ПАТРЭБ ІНШЫХ, – ГЭТА АСОБЫ, ЯКІЯ ПРАХОДЗЯЦЬ БЕЗ ЖЫЦЦЯ»

Учынкам міласэрнасці прысвяціў сваю пазачарговую агульную аўдыенцыю, якая прайшла 30 чэрвеня ў Ватыкане, Папа Францішак. Пантыфік папрасіў вернікаў не забывацца, што міласэрнасць – не нейкае тэарэтычнае пытанне, а стыль жыцця.

Святы Айцец узгадаў таксама свой нядаўні візіт у Арменію і падзякаваў усім, хто дапамог падрыхтаваць і правесці яго.

«Колькі разоў на працягу гэтых першых месяцаў Юбілею мы пачулі пра ўчынкі міласэрнасці! Сёння Пан заклікае нас зрабіць сур'ёзны рахунак сумлення. Варта, каб мы ніколі не забываліся, што міласэрнасць – гэта не абстрактнае слова, а лад жыцця. Чалавек можа быць міласэрным або неміласэрным. Гэта лад жыцця. Я выбіраю жыць як чалавек міласэрны ці як чалавек неміласэрны. Адна справа казаць аб міласэрнасці, а іншая Ч жыць ёй. Перафразуючы словы святога апостала Якуба (пар. 2, 14-17), мы можам сказаць: міласэрнасць без учынкаў мёртвая сама па сабе. І так на самой справе ёсць! Тым, што робіць міласэрнасць жывой, з'яўляецца яе пастаянная дынаміка выходжання насупраць патрэб і недахопаў людзей у складанай духоўнай і матэрыяльнай сітуацыі. Міласэрнасць мае вочы, каб бачыць, вушы, каб чуць, рукі, каб ставіць на ногі», – адзначыў Папа.

Менавіта штодзённасць, па словах Пантыфіка, дазваляе хрысціяніну дакрануцца да патрэбаў самых бедных і слабых, і тут патрэбна асаблівая адчувальнасць да пакут і галечы.

«Часам мы праходзім міма драматычных сітуацый беднасці, бо нам здаецца, што яны нас не датычаць. Усё працягваецца, як быццам нічога не адбылося, у абыякавасці, якая ў рэшце рэшт робіць нас крывадушнікамі; і, не ўсведамляючы таго, мы прыходзім да формы духоўнай летаргіі, што робіць розум неадчувальным, а жыццё бясплодным. Людзі, якія ідуць па жыцці, не заўважаючы патрэб іншых, не бачачы шматлікіх духоўных і матэрыяльных патрэб, – гэта асобы, якія праходзяць без жыцця, асобы, якія не чуюць іншых. Трэба добра памятаць: "Той, хто не жыве, каб служыць, не служыць, каб жыць"», – падзяліўся сваімі разважаннямі Святы Айцец.

Наколькі вялікі спектр аспектаў Божай міласэрнасці ў адносінах да нас, настолькі шматлікая група патрабуючых гэтай міласэрнасці ад нас, заўважыў Пантыфік. Папа дадаў, што «любы, хто спазнаў у сваім жыцці міласэрнасць Бога, не можа заставацца абыякавым да патрэбаў братоў», а «ўчынкі міласэрнасці – гэта не тэарэтычныя пытанні, але канкрэтнае сведчанне», «яны абавязваюць нас, закасаўшы рукавы, палегчыць пакуты».

«У сувязі са зменамі ў нашым глабалізаваным свеце памножыліся матэрыяльная і духоўная беднасць: таму давайце зробім месца для фантазіі міласэрнасці, каб вызначыць новыя спосабы працы. Дзякуючы гэтаму шлях міласэрнасці стане ўсё больш і больш канкрэтным. Таму вельмі важна, каб мы былі пільнымі, як ахоўнікі, каб перад абліччам беднасці, выпрацаванай культурай дабрабыту, хрысціянскі позірк не аслабеў і не страціў здольнасць заўважаць істотнае. Што значыць ісці да істотнага? Гэта шукаць Езуса, бачыць Езуса ў галодным, зняволеным, хворым, голым, беспрацоўным, у тым, хто вымушаны забяспечваць быт сваёй сям'і; бачыць Езуса ў гэтых нашых братах і сёстрах. Заўважыць Езуса ў самотным, сумным, у тым, хто блукае і патрабуе парады, і тым, каму патрэбна маўклівая прысутнасць у падарожжы, каб адчуваць, што нехта яго суправаджае. Гэта тыя справы, якіх Езус патрабуе ад нас», – сказаў Пантыфік.

Падчас агульнай аўдыенцыі Папа таксама нагадаў пра свой нядаўні візіт у Арменію, першую краіну ў свеце, якая прыняла хрысціянства ў пачатку чацвёртага стагоддзя. Пантыфік адзначыў, што армянскі народ у сваёй доўгай гісторыі сведчыў аб хрысціянскай веры праз мучаніцтва, аж да страшнага досведу стогадовай даўніны, калі яго спрабавалі знішчыць цалкам. Святы Айцец падзякаваў Богу за гэта падарожжа, выказаў словы ўдзячнасці Прэзідэнту Арменіі, Каталікосу ўсіх армян, каталіцкаму епіскапату і ўсяму армянскаму народу.

Папа нагадаў, што праз тры месяцы адправіцца ў Грузію і Азербайджан, дзве іншыя краіны Каўказа, каб ушанаваць старажытныя хрысціянскія карані і падтрымаць надзею і шлях міру.

«Як хрысціяне, мы пакліканы ўзмацняць нашы братэрскія адносіны, каб сведчыць аб Евангеллі Хрыста і быць зачынам больш справядлівага і салідарнага грамадства», – падкрэсліў Святы Айцец.

*Паводле беларускай рэдакцыі Ватыканскага радыё*

# ПАПА ФРАНЦІШАК ДА БЕДНЫХ: МАЛІЦЕСЯ ЗА БАГАТЫХ І МАРНАТРАЎНЫХ

«Вы дапамагаеце нам сустрэць Езуса, бо расказваеце пра Яго не столькі словамі, колькі ўсім сваім жыццём», – сказаў Папа ўдзельнікам пілігрымкі бедных з Ліёнскай дыяцэзіі (Францыя), якая прыбыла ў Рым на чале з кардыналам Філіпам Барбарэнам. Аўдыенцыя прайшла 6 ліпеня ў Зале Паўла VI у Ватыкане.

Пантыфік узгадаў постаць французскага святара Ёзэфа Врэзінскага, паслядоўнікі якога і выступілі арганізатарамі сустрэчы. Сваё жыццё гэты святар прысвяціў клопату пра бедных, якім заўсёды казаў: «Вы знаходзіцеся ў сэрцы Касцёла». «Езус заўсёды аддаваў перавагу такім людзям, як вы, якія перажывалі падобныя сітуацыі», – адзначыў Папа Францішак.

Святы Айцец падзякаваў ініцыятарам сустрэчы за адданасць місіі кс. Ёзэфа Врэзінскага, які замест абстрактных тэорый падзяляў з беднымі іх няпростую штодзённасць. «Вы не толькі выходзіце насустрач ім, якія саромяцца і хаваюцца, не толькі суправаджаеце, намагаючыся зразумець іх пакуты і прыняць іх роспач, але і ствараеце вакол іх супольнасць, вяртаючы ім сэнс існавання, ідэнтычнасць, пачуццё годнасці», – сказаў Пантыфік, звяртаючыся да арганізатараў. Папа заклікаў нанова адкрыць у Год Міласэрнасці дух салідарнасці, братэрства, узаемнай дапамогі і падтрымкі і жыць ім.

На заканчэнне сустрэчы Папа звярнуўся да пілігрымаў з просьбай аб выкананні місіі, якую, як падкрэсліў Пантыфік, «толькі вы, у сваёй беднасці, будзеце здольныя выканаць». Святы Айцец папрасіў маліцца за багатых, марнатраўных, крывадушнікаў гэтага свету, за ўсіх, хто мае дачыненне да існавання галечы ў свеце, каб Бог перамяніў іх сэрцы. «І я вам гарантую, што, калі будзеце так рабіць, станецца вялікая радасць у Касцёле, у вашых сэрцах і ў дарагой Францыі», – дадаў Папа.

Пілігрымку бедных з Ліёнскай дыяц эзій арганізавала асацыяцыя «Сябры ксяндза Ёзэфа Врэзінскага», каб такім чынам адзначыць 100-годдзе з дня нараджэння святара, які прысвяціў сваё жыццё бедным. Ён заснаваў міжнародны рух «Чацвёрты свет», у рамках якога сёння дзейнічае «Пастаянны форум па беднасці ў свеце» – сетка арганізацый і асобных людзей з больш чым ста краін, адданых місіі барацьбы супраць галечы ў духу адзінства і салідарнасці.

*Паводле беларускай рэдакцыі Ватыканскага радыё*

# НОВЫЯ СВЯТЫЯ І БЛАГАСЛАЎЛЁНЫЯ З'ЯВЯЦЦА Ў КАСЦЁЛЕ



8 ліпеня на сустрэчы з прэфектам Кангрэгацыі па справах Кананізацыі кардыналам Анджэло Амата Папа Францішак ухваліў дэкрэты аб зацвярджэнні цуду, мучаніцкай смерці і гераічнасці цнотаў.

У першым выпадку гаворка ідзе пра прызнанне цуду праз заступніцтва кс. Луіса Антоніо Роса Армьерэса, заснавальніка Кангрэгацыі сясцёр святога Анёла Ахоўніка, які жыў у XIX ст. Таксама Пантыфік ухваліў дэкрэты аб прызнанні мучаніцкай смерці айца Антоніо Арыбаса Оцігуэлы і шасці яго паплечнікаў з Кангрэгацыі місіянераў Найсвяцейшага Сэрца Езуса, якія загінулі за веру ў 1936 г. падчас грамадзянскай вайны ў Іспаніі, і свецкага верніка з Італіі Ёзэфа Майр-Нусэра, які адмовіўся прысягаць нацыстам, калі быў прызваны ў войска і прысуджаны да смерці ў канцэнтрацыйным лагеры Дахау. Ён памёр на шляху ў лагер у 1945 г. ад жорсткага абыходжання, голаду і смагі.

Шэсць дэкрэтаў, у якіх прызнаецца гераічнасць цнотаў, датычаць амерыканскага біскупа Альфонса Галегаса, іспанскага святара Рафаэля Санчэса Гарсіі, свецкага верніка з Іспаніі Андрэса Гарсіі Акоста, італьянскіх манахаў Джузэпэ Маркэці і Джакама Вале і італьянскай манахіні Марыі Піі ад Крыжа.

*Паводле беларускай рэдакцыі Ватыканскага радыё*

# ПАПА АДКАЗАЎ НА ПЫТАННІ ЖУРНАЛІСТАЎ У САМАЛЁЦЕ ПА ДАРОЗЕ З КРАКАВА



«Думаю, што несправядліва атаясамліваць іслам з насіллем і тэрарызмам. Несправядліва і няслушна», – сказаў Папа Францішак 31 ліпеня падчас прэс-канферэнцыі на борце самалёта па дарозе з Кракава ў Рым.

Адзін з журналістаў спытаў Святога Айца аб забойствах, якія здзяйсняюцца ў імя ісламу. «Мне не падабаецца казаць пра ісламскае насілле. Я штодзённа гартаю газеты і бачу насілле. У Італіі хтосьці забівае нарачоную, іншы цёшчу... І гэта ахрышчаныя каталікі, гэта гвалтоўныя каталікі. Калі кажу пра ісламскае насілле, павінен казаць таксама і пра насілле каталіцкае. Але не ўсе мусульмане і не ўсе каталікі гвалтоўныя. Гэта як у фруктовым міксе – такія ёсць у абедзвюх рэлігіях», – сказаў Папа.

Па словах Пантыфіка, пашырэнню тэрарызму спрыяе адсутнасць магчымасцяў у людзей. «Калі галоўнае месца ў цэнтры сусветнай эканомікі займае бажок грошай, а не чалавек – мужчына і жанчына, – гэта ўжо тэрарызм. Адрынуўшы цуд стварэння – чалавека – і паставіўшы на яго месца грошы, маем базавы тэрарызм, супраць усяго чалавецтва. Падумаем пра гэта», — заклікаў Святы Айцец.

Журналісты пацікавіліся, чаму Папа яшчэ не выказаўся пра сітуацыю ў Турцыі. Пантыфік спаслаўся на неабходнасць валодання поўнай інфармацыяй аб тым, што адбываецца ў краіне, дадаўшы, што «справа яшчэ не ясная». Святы Айцец падкрэсліў, што яго маўчанне не звязана з жаданнем пазбегнуць наступстваў для каталіцкай меншасці ў гэтай краіне. «Сапраўды, заўсёды трэба пазбягаць праблем для католікаў – і мы гэта робім, – але не коштам праўды», – сказаў Папа і нагадаў, што ўжо выказваўся пра рэчы, якія не падабаліся Турцыі, напрыклад, пра генацыд армянскага насельніцтва.

Пантыфік закрануў і тэму ватыканскага пасярэдніцтва ў вырашэнні канфлікту ў Венесуэле. Папа прызнаўся, што ў яго няма ўпэўненасці ў жаданні бакоў канфлікту, каб прадстаўнікі Апостальскай Сталіцы прымалі ўдзел у працы групы, якая пасярэднічае ў перамовах.

Каментуючы сваё падзенне падчас святой Імшы ў Чэнстахове, Пантыфік прызнаўся, што проста заглядзеўся на Маці Божую і забыўся пра прыступку. Папа патлумачыў, што падзенне не мела ніякіх наступстваў для яго здароўя і ён адчувае сябе цудоўна.

Самалёт польскай авіякампаніі «LOT» са Святым Айцом на борце зрабіў пасадку ў рымскім аэрапорце «Fiumicino» 31 ліпеня каля 21.30 па мясцовым часе.

*Паводле беларускай рэдакцыі Ватыканскага радыё*

# ПАНТЫФІК АДКАЗАЎ НА ПЫТАННІ ПОЛЬСКІХ БІСКУПАЎ

Небяспека секулярызацыі і атэізму, схільнасць да «абагаўлення» грошай, выхаванне моладзі, дзейнасць парафій, стаўленне да бежанцаў – такія пытанні ўздымаліся польскім епіскапатам падчас дыялогу з Папам Францішкам 27 ліпеня. Сустрэча адбылася ў катэдральным касцёле Кракава з удзелам каля 130 біскупаў.

Адказваючы на пытанне польскіх іерархаў адносна магчымых «лекаў» супраць атэізму і секулярызму, якія пагражаюць у тым ліку і Польшчы, Пантыфік нагадаў пра неабходнасць быць бліжэй да людзей, а таксама пра ўмацоўванне сувязі маладога пакалення з бабулямі і дзядулямі, якія былі і застаюцца асноўнай крыніцай і прыкладам веры.

Прагучала і пытанне аб дзейснасці і запатрабаванасці парафій як структурных адзінак Касцёла. Святы Айцец падкрэсліў, што парафія заўсёды застаецца незаменнай; гэта дом Божага народа. У працяг тэмы Папа нагадаў аб важнасці рэлігійных рухаў, якія ўнутры парафій набываюць асаблівае значэнне.

Таксама прадстаўнікі польскага епіскапату пацікавіліся стаўленнем Пантыфіка да бежанцаў. Святы Айцец прызнаў, што адзінай формулы паводзін у адносінах да гэтых людзей не існуе – усё залежыць ад канкрэтнай краіны, яе магчымасцяў, культуры і традыцый. Там не менш, па словах Папы, важна, наколькі гэта магчыма, заставацца па-хрысціянску адкрытымі і гасціннымі.

*Паводле беларускай рэдакцыі Ватыканскага радыё*

# «НЕ БОЙЦЕСЯ СВЕДЧЫЦЬ ПРА ХРЫСТА»

*Каля двух мільёнаў вернікаў прыняло ўдзел у Святой Імшы з Папам Францішкам, якая 31 ліпеня 2016 г. прайшла ў Бжэгах пад Кракавам і стала завяршальнай падзеяй Сусветных дзён моладзі*

**Касцёл без сцен**

Святая Імша адбылася ў кампусе Misericordia, пабудаваным спецыяльна для сустрэчы моладзі з Папам Францішкам падчас Сусветных дзён моладзі. Кампус выглядае такім чынам, што асноўная яго частка павернута тварам да вялізнага алтара.




Як адзначаюць арганізатары, архітэктар Станіслаў Немчык, які праектаваў алтар, кіраваўся ідэяй аб стварэнні «Касцёла без сцен». У цэнтра алтара – вялізная выява Езуса Міласэрнага з абраза, напісанага па просьбе св. Фаўстыны ў 1930-я гг.

Скіроўваючы прывітальнае слова да Пантыфіка на пачатку святой Імшы, арцыбіскуп Кракаўскі кардынал Станіслаў Дзівіш адзначыў, што пілігрымы, сабраныя на Імшу, – гэта «малады Касцёл трэцяга тысячагоддзя».

«Праз увесь час свайго прабывання ў Кракаве моладзь з усяго свету сведчыла аб радасці Евангелля і дзялілася энтузіязмам сваёй веры», – сказаў кардынал.



Арцыбіскуп Кракаўскі таксама дадаў, што падчас гэтай Імшы Касцёл у Польшчы будзе ўзносіць малітву падзякі за Пантыфіка і маліцца ў яго інтэнцыях. Іерарх заўважыў, што Імша пройдзе ў тым ліку і ў інтэнцыі «братоў і сясцёр, якія церпяць у гэтым свеце».

У музычным аздабленні Эўхарыстыі дапамагалі аркестр, а таксама сотні дзяўчат і хлопцаў, аб'яднаных напярэдадні СДМ у вялікі хор.

**«У вачах Хрыста вартасць чалавека бясцэнная»**

У гаміліі, прамоўленай на італьянскай мове, Святы Айцец прыгадаў гісторыю сустрэчы Езуса з Закхеем.

Звяртаючыся да моладзі, Пантыфік адзначыў: «Вы прыбылі сюды, каб сустрэць Езуса, як і Закхей у свой час. Ён сустрэўся, аднак, з некаторымі цяжкасцямі, якія сёння могуць напаткаць і вас».

Святы Айцец нагадаў, што Закхей быў невялікага росту, і гэта для яго было першай цяжкасцю, каб убачыць Езуса.

*Працяг на стар. 18*

# «НЕ БОЙЦЕСЯ СВЕДЧЫЦЬ ПРА ХРЫСТА»

*Працяг. Пачатак на стар. 17*

«Калі мы стаім далёка ад Езуса, то гэтаксама не бачым Бога. Тое ж датычыць і нашай веры: Святы Дух хоча жыць у нас – мы пакліканы да вечнага жыцця. Але нежаданне ўспрымаць сябе як Божае дзіця – гэта ўсё адно, што адвярнуцца ад Езуса ў іншы бок і затушыць план, які Ён мае ў адносінах да нас», – сказаў Пантыфік.



«Для Езуса, як паказвае Евангелле, не важна – высокі ты ці нізкі, бо кожны чалавек – каштоўны сам па сабе. Бог разлічвае на цябе. Ён глядзіць на цябе як на чалавека, а не на тое, чым ты валодаеш. Няма значэння, як ты апрануты ці які мабільны тэлефон маеш, важна, што ты ёсць – твая вартасць бясцэнная ў вачах Касцёла».

Святы Айцец звярнуў увагу на тое, што Бог любіць чалавека нашмат больш, чым чалавек сам сябе:

«Ён заўсёды чакае нас у надзеі, нават калі мы замыкаемся ў нашых крыўдах і смутку, быццам маючы вірус, які заражае і блакуе дзверы нашага сэрца. Гэты вірус пазбаўляе нас радасці, робячы самотнымі. Але Бог не губляе надзеі і заўсёды прабывае побач».

Папа Рымскі нагадаў, што жыццё дадзена чалавеку, каб любіць і быць любімым: «Кожную раніцу варта дзякаваць Богу за любоў да нас».

### «Не варта замыкаць свае жыццё ў шуфлядзе»

Прыгадваючы яшчэ адну перашкоду – паралізуючы сорам, які не даваў Закхею ўбачыць Езуса, – Папа Францішак адзначыў яго мужнасць у пераадоленні свайго страху.

«Можам сабе ўявіць, што адбывалася ў сэрцы Закхея. Разам з цікавасцю ўбачыць Езуса, ён баяўся зрабіць штосьці не так, каб не быць асмяяным іншымі. Але ён перамог гэты сорам, бо Езус быў яго мэтай. Прыклад Закхея вучыць нас, што мы не павінны замыкаць сваё жыццё ў шуфлядзе».

«Дарагая моладзь, не саромцеся занесці да Бога свае слабасці, а канкрэтна – грахі ў споведзі, – звярнуўся да моладзі Пантыфік. – Хрыстос агорне вас супакоем – не бойцеся гаварыць шчыра, не дайце сабе знячуліць душы, кіруйцеся Божай міласэрнасцю».




Трэцяй перашкодай Закхея Папа Францішак назваў натоўп, які спачатку блакаваў яму ўваход да Хрыста, а пасля асуджаў.

*Працяг на стар. 19*

# «НЕ БОЙЦЕСЯ СВЕДЧЫЦЬ ПРА ХРЫСТА»

*Заканчэнне. Пачатак на стар. 17-18*

«Часта перашкоды імкнуцца ўнушыць нам, што Бог вельмі суровы і толькі і робіць, што карае за зло, – сказаў Пантыфік. – Але сонца ўзыходзіць як над добрымі, так і над злымі. Над вамі могуць смяяцца, бо вы верыце ў Божую міласэрнасць. Але “благаслаўлёныя міласэрныя, бо яны міласэрнасць спазнаюць”».



Святы Айцец падкрэсліў, што Бог глядзіць у сэрца чалавека, а не на яго матэрыяльны дастатак ці «макіяж душы», у той час як натоўп схільны глядзець на чалавека зверху ўніз.

Пантыфік заахвоціў моладзь дзяліцца сваім хрысціянскім сведчаннем – сведчаннем веры – на працы, у школе, ва ўніверсітэце.

«Не бойцеся сведчыць пра Хрыста – многім вашае сведчанне веры можа дапамагчы. Словы, скіраваныя Езусам да Закхея, адносяцца і да нас: адкрыйце дзверы ў сваім сэрцы для Бога», – заключыў Пантыфік.




**Маўчанне як знак засяроджанасці**

Напрыкацы гаміліі, звяртаючыся да ўдзельнікаў Сусветных дзён моладзі, Пантыфік пажадаў ім зрабіць Евангелле арыенцірам свайго жыцця.

«Хрыстос хоча прыйсці ў ваш дом, а не толькі застацца ва ўспамінах аб удзеле ў СДМ. Таму няхай Евангелле ўказвае вам шлях, будучы вашым навігатарам на дарогах жыцця».

Яскравым момантам святой Імшы сталі хвіліны маўчання пасля святой Камуніі. Папа Францішак заахвоціў моладзь у хвіліне цішыні прыгадаць падзеі СДМ і тое, што адбывалася з пілігрымамі за гэты час.

Маўчанне двух мільёнаў чалавек стала знакам засяроджанасці ў малітве і еднасці паміж сабой.

На завяршэнне святой Імшы Папа Францішак абʼявіў сталіцу наступных Сусветных дзён моладзі. У 2019 годзе сустрэча маладых людзей з Пантыфікам пройдзе ў Панаме.

*Паводле Catholic.by*

# «У ПЕРАСЯЧЭННІ КУЛЬТУР, МОЎ І ТРАДЫЦЫЙ НА СДМ І ПРАЯЎЛЯЕЦЦА ПАЎСЮДНАСЦЬ КАТАЛІЦКАГА КАСЦЁЛА»

31-я Сусветныя дні моладзі ў Кракаве паступова ідуць да завяршэння. Суботні дзень у Кракаве нагадвае «перасяленне народаў»: сотні пілігрымаў крочаць у напрамку кампуса «Misericordiae», дзе ўвечары распачнецца моладзевае чуванне з удзелам Папы Францішка.

Многія нясуць з сабою спальнікі і карыматы, плануючы застацца на начным чуванні. У іх ліку – і вялікая група пілігрымаў з Гродзенскай дыяцэзіі на чале з кс. Антоніем Грэмзам.

Перад выхадам у кампус, дзе адбудзецца чуванне, пілігрымы сабраліся на заключную Святую Імшу для беларусаў у касцёле св. Максімільяна Кольбэ, якую ўзначаліў біскуп Віцебскі Алег Буткевіч.

Віцебскі ардынарый – адзін з шасці прадстаўнікоў епіскапату Беларусі, якія прымаюць удзел у Сусветных днях моладзі. У Кракаве знаходзяцца таксама арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч, біскуп Аляксандр Кашкевіч, біскуп Антоні Дзям'янка, біскуп Казімір Велікаселец і біскуп Юзаф Станеўскі. Сваімі ўражаннямі ад СДМ падзяліліся некаторыя біскупы.

**Удзел католікаў у СДМ – сведчанне адраджэння Касцёла ў Беларусі**

Для біскупа Гродзенскага Аляксандра Кашкевіча СДМ у Кракаве – другія па ліку. У пачатку 1990-х гадоў іерарх удзельнічаў у СДМ у Чэнстахове.

Падчас сёлетняй сустрэчы моладзі гродзенскі ардынарый прымаў удзел у Святой Імшы з Папам Францішкам у санктуарыі Божай Міласэрнасці ў Лагеўніках, а таксама на Яснай Гары, Святая Імша на якой была прымеркавана да 1050-годдзя Хросту Польшчы.

«Гледзячы на шматлікіх пілігрымаў з розных кантынентаў, шчырых у сваёй радасці, я ўсвядоміў, наколькі цудоўным з'яўляецца час, які я магу назіраць – час, калі Божая міласэрнасць запаліла ўвесь свет», — адзначае іерарх.

*Працяг на стар. 21*



# «У ПЕРАСЯЧЭННІ КУЛЬТУР, МОЎ І ТРАДЫЦЫЙ НА СДМ І ПРАЯЎЛЯЕЦЦА ПАЎСЮДНАСЦЬ КАТАЛІЦКАГА КАСЦЁЛА»

*Працяг. Пачатак на стар. 20*

«Хочацца, каб з СДМ беларуская моладзь узяла з сабою радасць і адкрытасць, давер – каб заўсёды была маладой у сваім сэрцы», – дадае біскуп.




Біскуп Віцебскі Алег Буткевіч, як і дапаможны біскуп Гродзенскай дыяцэзіі Юзаф Станеўскі, называе сустрэчу ў Кракаве першай у сваім святарскім жыцці.

«Я вельмі ўражаны колькасцю вернікаў, якія прыбылі сюды, – адзначае віцебскі ардынарый. – Вельмі цешыць, што шмат моладзі прыехала ў Кракаў з Беларусі. Гэта добры знак, які паказвае, што на нашай зямлі – так пацярпелай ад атэізму – моладзь з'яўляецца тым парасткам веры, які сведчыць пра адраджэнне Касцёла ў Беларусі».

Як прызнаецца біскуп Віцебскі, на СДМ у Кракаве пануе «вельмі прыязная атмасфера ўзаемапаразумення».

«Для Бога няма нічога немагчымага – хто ведае, магчыма, калі-небудзь СДМ могуць прайсці і ў Беларусі. Гэта залежыць ад Бога, ад нашага жадання і ад нашай малітвы», – заключае іерарх.

**СДМ як духоўнае яднанне**

Біскуп Юзаф Станеўскі адзначае, што, як адказны за працу з моладдзю пры Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі, суправаджае моладзь з моманту адпраўлення адмысловага цягніка «Гродна-Кракаў»:

«Вельмі радасна перажываць тое ж, што перажываюць яны, – я быццам і сам станаўлюся маладым і бадзёрым. Маю надзею, што праз гэту весялосць моладзь не забываецца на малітву і руплівасць ва ўзрастанні веры і адданасці Касцёлу і Богу».

Гаворачы пра касцёл св. Максімільяна Кольбэ, які на час СДМ стаў «другім домам» для беларускай моладзі, біскуп адзначыў, што «на сустрэчу са Святым Айцом мы ідзём слядамі нашых святых» – як вядома, святы Максімільян Кольбэ пэўны час працаваў у Гродне.




*Працяг на стар. 22*

# «У ПЕРАСЯЧЭННІ КУЛЬТУР, МОЎ І ТРАДЫЦЫЙ НА СДМ І ПРАЯЎЛЯЕЦЦА ПАЎСЮДНАСЦЬ КАТАЛІЦКАГА КАСЦЁЛА»

*Заканчэнне. Пачатак на стар. 20-21*

«Добра, што СДМ існуюць, і важна, каб наша моладзь цаніла гэтую магчымасць духоўнага яднання з каталіцкай моладдзю ўсяго свету. На жаль, у часы маёй маладосці такіх сустрэч не было».

**СДМ – пілігрымка веры і братэрства**

Сапраўдным рэкардсменам па ўдзелу ў СДМ сярод членаў беларускага епіскапату з'яўляецца Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч, для якога гэта ўжо дзявятая сустрэча моладзі.

«Мяне вельмі цешыць, што такія СДМ праводзяцца, — прызнаецца іерарх. — Гэта не толькі сустрэча са Святым Айцом, але і сустрэча з аднагодкамі ўсяго свету. І ў гэтым перасячэнні сусветных культур, моў і традыцый і праяўляецца паўсюднасць Каталіцкага Касцёла».

Прыгадваючы выказванне св. Яна Паўла ІІ пра тое, што «моладзь – гэта надзея для свету», арцыбіскуп адзначае, што як душпастыр заўсёды хацеў бы мець гэтую надзею.

«Нездарма адзін з дакументаў Касцёла – Пастырская канстытуцыя аб Касцёле ў сучасным свеце – носіць назву “Gaudium et spes” (радасць і надзея): моладзь – гэта не толькі радасць, але заўсёды і надзея. Я з вялікай надзеяй і з радасцю гляджу на гэтых людзей – удзельнікаў СДМ», — дадае іерарх.

«Мне ўжо 70 гадоў, але, прыбываючы на СДМ, я сапраўды маладзею, бачачы столькі моладзі. Яна прыехала не на экскурсію ў гістарычны Кракаў, але каб дакрануцца да Бога, каб паглыбіць сваю веру і засведчыць яе перад моладдзю іншых краін.




Мне вельмі спадабалася, як у сваім прывітальным слове да ўдзельнікаў СДМ сказаў Папа Францішак: “Гэты форум моладзі – пілігрымка веры і братэрства”. Так яно і ёсць».

*Паводле Catholic.by*

## СВЯТЫ ХРОСТ

### З радасцю паведамляем, што за апошні час Сакрамант Хросту атрымалі:



***Маргарыта Главацкая***, дачка Андрэя і Вольгі
***Ніка Клюй***, дачка Віталія і Іны
***Цімур-Пётр Лоўчаў***, сын Арцёма і Яніны
***Данііл Сямёнаў***, сын Антона і Караліны
***Сямён Каласоўскі***, сын Ігара і Анастасіі
***Дзіяна Каласоўская***, дачка Ігара і Анастасіі
***Мілана Каласоўская***, дачка Ігара і Анастасіі
***Марк Турчыновіч***, сын Міраслава і Наталлі
***Арцемій Швыроў***, сын Аляксандра і Вікторыі
***Міхаліна-Марыя Матронкіна***, дачка Віталія і Веранікі
***Мікіта-Антоній Пачабыт***, сын Дзмітрыя і Вольгі
***Лізавета Любінская***, дачка Дзмітрыя і Вольгі
***Анна Сак***, дачка Сяргея і Таццяны
***Ганна Калошка***, дачка Паўла і Марыі
***Арыадні Рэмані Стаўру***, сын Стаўроса і Марыі
***Елізавета Князева***, дачка Мікалая і Іны
***Давід Зарыхта***, сын Сяргея і Ірыны
***Кацярына Войтава***, дачка Віталія і Наталлі
***Багдан Райко***, сын Андрэя і Юліі
***Эліна-Гэлена Зелянко***, дачка Алега і Марыны
***Паліна Савуць***, дачка Алега і Кацярыны
***Эмілія Савуць***, дачка Алега і Кацярыны
***Раман Паўловіч***, сын Юрыя і Вольгі
***Ева-Алівія Маслыка***, дачка Аляксандра і Караліны
***Камілія Шпілеўская***, дачка Арцёма і Зінаіды
***Раман Мінаеў***, сын Максіма і Наталлі
***Ульяна-Алена Андрэева***, дачка Юрыя і Алены
***Ксенія-Кацярына Гейна***, дачка Кірыла і Вольгі
***Максім-Ян Клютко***, сын Валерыя і Наталлі
***Кірыл Фурман***, сын Аляксандра і Марыны

## ВІНШУЕМ МАЛАДЫХ

### Давяраем добраму Богу сужэнскае жыццё маладых людзей, якія вырашылі быць заўсёды разам, і просім для іх асаблівага Божага блаславення

Алега Удалеева і Аляксандру Усаву
Аляксея Хаткевіча і Алену Тарасевіч
Андрэя Горбача і Анну Парнуўскую
Аляксея Сімкіна і Вольгу Гільвіну
Аляксея Палачанскага і Таццяну Лахоня-Лучкоўскую
Яўгенія Патапчыка і Веру Шынкарэнка
Аляксея Шупеньку і Надзею Лазар
Станіслава Бажычка і Наталлю Бажычка (Русіну)
Марыюса Гудзяміса і Кацярыну Радзюк
Юрыя Пілеца і Анастасію Амялькову
Аляксея Баброва і Анастасію Шыманка
Паўла Батуна і Вікторыю Міцкевіч

**СВЯТАЯ ІМША БУДЗЕ АДСЛУЖАНА**

_______ . _______ *2016* *у* _______ . _______ *гадзін*

*у інтэнцыі* ________________________________________________

________________________________________________

| 8 жніўня Панядзелак | 9 жніўня Аўторак | 10 жніўня Серада | 11 жніўня Чацвер | 12 жніўня Пятніца | 13 жніўня Субота | 14 жніўня Нядзеля |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 7.00 – * | 7.00 – * | 7.00 – * | 7.00 – * | 7.00 – ✞ | 8.00 – * | 8.00 – * |
| 9.00 – ✞PL | 9.00 – ✞PL | 9.00 – *PL | 9.00 – ✞PL | 9.00 – * | 9.00 – ✞ | 9.00 – * |
| 12.00 – ✞ | 12.00 – ✞ | 12.00 – * | 12.00 – * | 12.00 – * | 12.00 – ✞ | 11.00 – S |
| 15.00– Вяч | 15.00 – Вяч | 15.00 – Вяч | 15.00 – Вяч | 15.00 – Вяч | 15.00 – Вяч | 13.00 – *PL |
| 17.00 – ✞ | 17.00 – * | 17.00 – ✞ | 17.00 – ✞ | 17.00 – ✞ | 17.00 – * | 15.00 – 👪 |
| 19.00 – * | 19.00 – * | 19.00 – ✞ | 19.00 – * | 19.00 – * | 19.00 – * | 15.00 – Вяч PL |
| | | | | | | 17.00 – * |
| | | | | | | 19.00 – * |
| | | | | | | 21.00 – * |

* – Святая Імша ў інтэнцыі аб здароўі, Божым блаславенстве, апецы Маці Божай
✞– Святая Імша ў інтэнцыі памерлых
S – Summa – Святая Імша ў інтэнцыі парафіі
PL – Святая Імша на польскай мове
Вяч – Вячыстая Святая Імша за чыстцовыя душы
**скл** – Святая Імша складковая; **мл** – Святая Імша для моладзі; **слых** – Святая Імша для глуханямых

**Вячыстая Адарацыя Найсвяцейшага Сакраманту** — у капліцы Маці Божай Будслаўскай
**15.00** — Вячыстая Святая Імша ля алтара Божай Міласэрнасці ў інтэнцыі памерлых

# АНОНСЫ

## КАСЦЁЛ СВ. СЫМОНА І СВ. АЛЕНЫ АРГАНІЗОЎВАЕ ПЕРАПРАШАЛЬНЫЯ ПІЛІГРЫМКІ Ў БУДСЛАЎ

У кожную першую суботу месяца ад Чырвонага касцёла адпраўляюцца аўтобусы з вернікамі да Будслаўскай святыні з мэтаю перапрашэння Маці Божай за знявагі, якія наносяць Ёй людзі.

13 мая 1917 г. Маці Божая аб'явілася ў Фаціме траім дзецям. Яна прасіла іх, каб яны абвясцілі, што Маці Божая прыйдзе ў хвіліну смерці з ласкамі, патрэбнымі для збаўлення, да ўсіх тых, хто на працягу пяці месяцаў у першыя суботы прыступіць да споведзі, прыме Святую Камунію, згаворыць адзін Ружанец і на працягу 15 хвілін разважання над ружанцовымі таямніцамі разам з Марыяй будзе маліцца, каб перапрасіць Пана Бога.

Пілігрымаў суправаджае святар, які моліцца разам з імі. У аўтобусе вернікі моляцца літаніямі, Ружанцам, спяваюць духоўныя песні.

***Праграма пілігрымкі:***

–Прыезд у Будслаў (12.00). Магчымасць споведзі. Святая Імша.(Імша праходзіць вельмі ўрачыста: чытаецца Евангелле, каментар да Слова Божага, пілігрымы прыносяць да алтара дары: кветкі, ружанец, свечку, хлеб, плады зямлі, Святыя Дары).
–Ружанец перапрашэння да Маці Божай, у якім прымае ўдзел моладзь.
–Перапынак на абед і гарбату ў Доме пілігрыма.
–Вяночак да Божай Міласэрнасці (а 15-й гадзіне).
–Асвячэнне вады святаром.
–Вяртанне ў Мінск.

Па дарозе дадому вернікі дзякуюць Маці Божай за час, які правялі з Ёю і Яе сынам. Таксама даюць сведчанні, якія ўражанні засталіся ў іх сэрцах пасля гэтай вандроўкі.

Наступная аўтобусная пілігрымка адбудзецца 6 жніўня (першая субота жніўня). Ад'езд а 9-й гадзіне раніцы ад Чырвонага касцёла.

***Запісацца можна ў сакрысты Чырвонага касцёла і па тэлефонах:***

+375 29 167-72-23 – Ілья;
+375 29 246-62-97, +375 25 618-17-50 – Уладзімір;
+375 33 337-44-95 – Ірына.

Голас душы № 6-7 (532) 2016. Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1188. Выдадзена міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь 28 студзеня 2016 г.
Заснавальнік: грамадскае аб'яднанне "Хрысціянскае таварыства міласэрднасці". Выдаецца з верасня 2000 г. на беларускай, рускай, лацінскай і польскай мовах.
Галоўны рэдактар – Кс. Уладыслаў Завальнюк, адказны рэдактар – Наталля Лаўрэнка, тэхнічны рэдактар – Кацярына Качарго, карэктар – Аліна Грачухіна.
Падпісны індэкс: 63135.Свабодны кошт.
Адрас рэдакцыі: 220050, г. Мінск, вул. Савецкая, 15. Тэл.: (017) 200-44-15, (017) 200-56-32. Факс: (017) 200-55-61, E-mail: vlad_za@tut.by
www.chyrvony.by. Падпісана да друку 28.07.2016. Фармат 60×84 1/8. Надрукавана СТАА "Эвалайн", вул. Рыбалка, 9, оф.23, 220033 г. Мінск.